

# ПОШУКАВАЯ СІСТЭМА «ДАПАМОЖНІК»: ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ



**Вячаслаў Насевіч,**
кандыдат гістарычных навук

Анлайнавая пошукавая сістэма *helper.archonline.by*, якая дапамагае высветліць ці ўдакладніць інфармацыю, неабходную для генеалагічнага пошуку ў беларускіх архівах, пачала працаваць 23 мая 2017 г. У адпаведнасці са сваім прызначэннем яна атрымала назву «Дапаможнік» і разлічана ў першую чаргу на тых карыстальнікаў, якія толькі пачынаюць стварэнне свайго генеалагічнага дрэва, шукаюць аддаленых продкаў на тэрыторыі Беларусі.

Сістэма забяспечвае два асноўныя варыянта пошуку: па прозвішчах і па назвах паселішчаў. Калі карыстальнік ведае толькі прозвішча сваіх продкаў, ён можа высветліць, у якіх населеных пунктах Беларусі яно сустракалася ў першай палове – сярэдзіне XX ст., да пачатку масавай урбанізацыі. Звесткі пра распаўсюджанне прозвішчаў былі ўзяты з кніг серыі «Памяць», якія выдаваліся з 1985 па 2005 г. Яны ствараліся на беларускай мове, таму і пошук адбываецца толькі на ёй.

Калі карыстальніка цікавіць канкрэтнае паселішча, ён мае магчымасць атрымаць звесткі пра яго, неабходныя для генеалагічнага запыту ў гістарычныя архівы альбо для самастойнага пошуку ў чытальнай зале. Сістэма выдае назвы паселішча на рускай і беларускай мовах з улікам перайменаванняў і звесткі пра яго прыналежнасць да тых тэрытарыяльных адзінак, па якіх у архівах звычайна згрупаваны дакументы генеалагічнага характару: паветаў Расійскай імперыі і Рэчы Паспалітай, валасцей, каталіцкіх альбо праваслаўных прыходаў, феадальных маёнткаў (з пазначэннем прозвішча іх уладальнікаў, бо некаторыя віды крыніц згрупаваны якраз па прозвішчах уласнікаў). Можна даведацца таксама пра прыналежнасць да сельскага альбо пасялковага савета ў апошнія дзесяцігоддзі.

Месцазнаходжанне паселішчаў, знойдзеных пры абодвух варыянтах пошуку, адлюстроўваецца на электроннай карце. Важна, што можна знайсці інфармацыю не толькі пра існуючыя зараз, але і пра тыя, якія зніклі на працягу XX ст. У гэтым сэнсе пошукавая сістэма не мае аналагаў у нашай краіне.

Стварэнне «Дапаможніка» з'явілася вынікам доўгай працы, якая вялася ў Беларускім навукова-даследчым цэнтры электроннай дакументацыі з часу яго заснавання. Увесь час кіраваў даследаваннямі аўтар гэтых радкоў, а прымалі ў ёй удзел вельмі многія спецыялісты, за што ім трэба сардэчна падзякаваць. Ужо ў 1998 г. пачала распрацоўвацца, а ў 1999 г. была размешчана ў Інтэрнэце першая версія раздзела «Генеалогія»

на сайце «Архівы Беларусі». Адначасова пачалося стварэнне дапаможных сродкаў, якія б дазволілі карыстальніку высветліць сучасную і мінулую адміністрацыйную прыналежнасць паселішчаў. У 1999 г. у Беларускім навукова-даследчым цэнтры электроннай дакументацыі (БелНДЦЭД) пачалася работа над электронным атласам-даведнікам «Губерня», якая прадугледжвала перавод у анлайн-прастору спісаў населеных пунктаў па валасцях і паветах беларускіх губерняў Расійскай імперыі розных перыядаў, іх лакалізацыю і адлюстраванне сродкамі геаінфармацыйнай сістэмы. Дзеля гэтага назва кожнага паселішча і змешчаныя ў спісе звесткі пра яго не толькі пераводзіліся ў лічбавы выгляд праз сканаванне і распазнаванне, але і дапаўняліся геаграфічнымі каардынатамі. Асноўнай крыніцай для гэтага паслужылі аркушы дэталёвай ваеннатапаграфічнай карты еўрапейскай Расіі маштабу 3 вярсты ў цалі (1:126 000), так званай трохвёрсткі. Зараз іх якасныя электронныя копіі знаходзяцца ў вольным доступе ў Інтэрнэце, але ў канцы XX ст. аб гэтым даводзілася толькі марыць. Амаль поўны камплект аркушаў трохвёрсткі па тэрыторыі сучаснай Беларусі ўдалося выявіць у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) у Мінску, копіі некалькіх недастаючых аркушаў былі замоўлены ў гістарычных архівах Літвы і Расіі.

У 2004 г. завяршылася работа па тэрыторыі Мінскай губерні і распачалося стварэнне атласа-даведніка «Губерня» па беларускіх паветах Віленскай і Гродзенскай губерняў. Праца над спісамі Магілёўскай і Віцебскай губерняў ускладнялася тым, што меліся яны толькі на пачатак XX ст., пры тым нізкая якасць арыгіналаў вымусіла набіраць іх цалкам праз клавіятуру. Гэтую справу ўзялі на сябе супрацоўнікі НГАБ у Мінску, дзе захоўваюцца асобнікі абодвух спісаў. На працягу 2004–2005 гг. імі былі аблічбаваны звесткі па Магілёўскай губерні, у 2005–2006 гг. зроблены спіс па беларускіх паветах Віцебскай губерні.

На працягу 2009–2010 гг. у РУП «Белкартаграфія» працавалі над другім томам «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» (галоўны рэдактар – В. Насевіч). У ім прадугледжвалася генеральная карта «Беларускія землі ў канцы XVIII стагоддзя». Супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Я.К. Анішчанка падрыхтаваў у электронным выглядзе папярэдні спіс беларускіх паселішчаў, якія прыгадваліся ў крыніцах адпаведнага перыяду і падлягалі адлюстраванню на карце. В. Насевіч правёў яго ўдакладненне па шэрагу крыніц і здзейсніў інтэграцыю паселішчаў спіса і даведніку «Губерня». Апрача таго, была здзейснена прывязка гістарычных мясцін да сучаснай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры,









яны ўпершыню былі пазначаны тымі ж унікальнымі ідэнтыфікатарамі, што і ў сучасных матэрыялах. Вынік гэтай працы знайшоў адлюстраванне ў гісторыка-геаграфічным паказальніку да другога тома атласа, які пабачыў свет у 2013 г. У ім былі пазначаны каля 22 тыс. населеных пунктаў XVIII ст., большасць з якіх існуе да сёння.

Наступны крок на шляху стварэння «Дапаможніка» дазволіла здзейсніць работа над даведнікам па гісторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Беларусі з 1981 па 2010 г., якую БелНДЦЭД ажыццяўляў у 2010–2011 гг. Гэта праца была выдадзена ў папяровым выглядзе, але ў якасці электроннага дадатку да яго створаны кампакт-дыск, на якім былі лакалізаваны ўсе населеныя пункты, што існавалі ў азначаны час (каля 28,3 тыс.) са звесткамі пра іх з 6 даведнікаў па абласцях краіны, падрыхтаваных у свой час краязнаўцам Я.Н. Рапановічам і апублікаваных на працягу 1977–1986 гг. выдавецтвам «Навука і тэхніка». Гэтыя звесткі былі інтэграваны з матэрыяламі Адзінага рэестра адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь, які быў створаны да таго часу Нацыянальным кадастравым агенцтвам, а таксама з дадзенымі перапісаў насельніцтва Беларусі 1999 і 2009 гг. па кожным паселішчы, размешчанымі ў вольным доступе ў Інтэрнэце.

Наспела неабходнасць стварыць інтэграваны інфармацыйны рэсурс, які аб'ядноўваў бы вынікі ўсіх гэтых праектаў, а таксама дагэтуль недастаючыя звесткі са спісаў населеных месцаў Віленскай і Гродзенскай губерняў на пачатак XX ст. Адпаведная тэма была ўключана ў план навукова-даследчых работ БелНДЦЭД у 2012 г. і паспяхова завершана ў наступным годзе.

Дзякуючы гэтай працы храналагічны слой са звесткамі на пачатак XX ст. ахапіў усю Беларусь: там былі адзначаны каля 60 тыс. паселішчаў, з іх на сучаснай тэрыторыі было 38 379. Магчымасці для лакалізацыі значна павялічыліся з прычыны таго, што на той момант у анлайн-прасторы ўжо былі прадстаўлены не толькі якасныя сканы ўсіх аркушаў трохвёрсткі, але і больш позні і падрабязныя тапаграфічныя карты: Двухвёрстная карта Заходняй пагранічнай прасторы; Аднавёрстная карта Заходняй пагранічнай прасторы; савецкія і польскія тапаграфічныя карты 1920–1930-х гг. маштабу 1:100 000 і «кіламетроўкі» (Mapa Taktyczna Polski, карта Генеральнага штаба РККА).

Дзякуючы таму, што ў НГАБ у Гродне ў электронным выглядзе былі створаны геаграфічныя паказальнікі паселішчаў Гродзенскай і беларускай часткі Віленскай губерні па праваслаўных і каталіцкіх прыходах, іх звесткі аб'ядналі з дадзенымі спісаў населеных месцаў Расійскай імперыі, у якіх адноснасць да прыходаў адсутнічала. Прыналежнасць паселішчаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў да маёнткаў па стану на 1840-я гг. удалося часткова пазначыць, выкарыстаўшы інвентары панскіх маёнткаў з фондаў НГАБ у Мінску.

Але самай маштабнай задачай, вырашанай у рамках гэтай тэмы, стала аблічбоўка спісаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і загінуўшых падчас яе мірных жыхароў, а таксама ахвяраў палітычных рэпрэсій 1930–1950-х гг., надрукаваных у гісторыка-дакументальных хроніках гарадоў і раёнаў Беларусі серыі «Памяць». Гэта дазволіла адлюстраваць распаўсюджанне прозвішчаў з прывязкай да населеных пунктаў, у якіх нарадзіліся ці жылі ў адпаведны час іх носьбіты. У інфармацыйным рэсурсе былі прозвішчы са спісаў усіх раёнаў і гарадоў, за выключэннем Мінска і абласных цэнтраў, дзе пераважная большасць асоб нарадзілася ў іншых мясцінах, а іх прозвішчы ўключаны ў рэестры з раёнаў іх паходжання. Усяго створана звыш 340 тыс. запісаў, якія фіксуюць пэўнае прозвішча ў пэўным паселічшы, кожнае з якіх было пастаўлена ў адпаведнасць з інтэграваным спісам Беларусі, які ўрэшце склаў каля 47 тыс. аб'ектаў (з іх да сёння існуе палова – каля 23,5 тыс.). Лакалізаваць удалося 45 288 паселішчаў.

Такім чынам, быў створаны інфармацыйны рэсурс, унікальны не толькі паўнатой, але і ўзаемасувяззю ўсіх сваіх частак. Але ён быў даступны толькі ў лакальнай вылічальнай сетцы БелНДЦЭД. Заставалася вырашыць апошнюю задачу – зрабіць пляцоўку дасягальнай для ўсіх карыстальнікаў. Спачатку разглядаліся два варыянты. Максімальны прадугледжваў інтэграцыю запісаў не толькі паміж сабой, але і з навукова-даведачным апаратам архіваў, што дазволіла б карыстальніку атрымаць не толькі звесткі пра пэўнае паселішча, але і спасылкі на архіўныя фонды, у якіх захоўваецца адпаведная генеалагічная інфармацыя. Але калі канчаткова вызначыліся памеры фінансавання, стала зразумела, што на такі амбіцыйны праект з удзелам спецыялізаваных на веб-праграмаванні знешніх арганізацый сродкаў не хопіць. Прыйшлося

задаволіцца больш сціплым варыянтам, які быў рэалізаваны на працягу 2016 г. уласнымі сіламі БелНДЦЭД. Фактычна ўсю тэхнічную работу па стварэнні праграмных сродкаў выканаў адзін чалавек – навуковы супрацоўнік цэнтра А. Яскевіч.

Канешне, рэалізацыя максімальнага варыянта пошукавай сістэмы прынесла б яшчэ больш карысці. Перспектывы яе развіцця бачацца ў першую чаргу праз супрацоўніцтва з нефармальнымі суполкамі генеалогаў-аматараў, якія ў апошнія гады дасягнулі значных вынікаў у індэксацыі даведачнай інфармацыі з архіваў. У якасці прыклада можна прывесці сайт *radzima.net*, на якім таксама прадстаўлены даныя па адміністрацыйнай прынадлежнасці населеных пунктаў Беларусі, у тым ліку тых, што адносяцца да прыходаў і маёнткаў. У асноўным гэтыя матэрыялы паходзяць з тых жа крыніц, што выкарыстоўваліся пры стварэнні «Дапаможніка». Але на платнай версіі сайта маецца і арыгінальны кантэнт, створаны намаганнямі валанцёраў. Так, там можна знайсці даныя пра прыналежнасць да сельскіх саветаў і раёнаў БССР на 1926 г., якія дапамагаюць пры пошуку звестак перапісу насельніцтва, які адбыўся ў тым годзе і матэрыялы якога (у тым ліку спісы домагаспадарак) захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Беларусі.

Позняя апрацоўка матэрыялаў гэтага перапісу значна павялічыла б магчымасці пошуку паводле прозвішчаў. Хаця ў большасці спісаў маюцца прозвішча, імя і імя па бацьку (а часам наогул ініцыялы) толькі галавы гаспадаркі, яны зафіксаваны на рускай мове, што дапаўняе інфармацыю кніг «Памяць» і дазволіла б весці пошук на дзвюх мовах. Апрача таго, звесткі перапісу 1926 г. змяшчаюць значна больш прозвішчаў і населеных пунктаў, чым зафіксавана ў спісах для кніг. На час перапісу існавала яшчэ вялікая колькасць дробных паселішчаў (хутароў, фальваркаў, былых панскіх двароў), якія зніклі ў працэсе калектывізацыі. Людзі адтуль перасяліліся ў іншыя раёны, і ў кнігах «Памяць» звычайна фіксуецца толькі новае месца іх жыхарства.

Аўтар правёў выбарачнае параўнанне інфармацыі кніг «Памяць» з матэрыяламі перапісу 1926 г. па большай частцы былога Халопеніцкага раёна. Гэта стала магчыма дзякуючы таму, што спісы домагаспадарак па гэтым раёне былі аблічбаваны кімсці з валанцёраў і размешчаны ў адным з аматарскіх рэсурсаў па генеалогіі, які запазычыў назву праекта БелНДЦЭД і таксама называецца «Дапаможнік». Параўнанне сведчыць, што на ахопленай абедзвюма крыніцамі частцы Халопеніцкага раёна (без мястэчка Халопенічы і Траянаўскага сельсавета) у матэрыялах перапісу прадстаўлены 299 населеных пунктаў і 1140 прозвішчаў, а ў спісах з кніг «Памяць» – 142 і 710 адпаведна. Пры тым каля 570 прозвішчаў, зафіксаваных перапісам, у кнігі «Памяць» не трапілі. І наадварот, там ёсць 142 прозвішчы, якія адсутнічаюць у спісах домагаспадарак 1926 г. Відавочна, што спалучэнне абедзвюх крыніц значна ўдасканаліла б магчымасці пошуку.

Ну і, безумоўна, вельмі дапамаглі б пачынаючым генеалогам дакладныя спасылкі на архіўныя справы, у якіх маюцца звесткі пра жыхароў кожнага паселішча. Некаторыя валанцёрскія суполкі выстаўляюць у Інтэрнэце такія даныя па асобных мясцінах, з якімі яны працуюць. Робяцца спасылкі і на стужкі мікрафільмаў, якія былі зняты ў беларускіх архівах у 1990-я гг. Генеалагічным таварыствам штата Юта, а зараз аблічбаваны і размешчаны ў вольным доступе на сайце *FamilySearch*, дзе маецца і створаная намаганнямі валанцёраў пошукавая сістэма (*familysearch.org/search/catalog*). Асабліва цікавы вопыт сайта *hryc.by*, дзе валанцёры робяць спасылкі непасрэдна на кадры кожнай царквы, якая маецца на мікрафільме, з пазначэннем архіўнага шыфра адпаведнай справы. Пераход па такой спасылцы магчымы праз клік на электроннай карце, на якой, падобна сістэме «Дапаможнік», у выніках пошуку адлюстроўваецца месцазнаходжанне царквы альбо касцёла ці іншай рэлігійнай установы, у якой вяліся метрычныя кнігі.

Вельмі станоўчы вопыт дэманструе міжнародны валанцёрскі праект «Великие описи», на якім розныя суполкі генеалогаў могуць размяшчаць выяўленую імі інфармацыю пра генеалагічныя крыніцы ў архівах на тэрыторыі былога СССР. У прыватнасці, беларуская суполка «Жніво» (*inv.velikie.org/doc/zhnivo/*) нядаўна распачала амбіцыёзны праект па дапаўненні той інфармацыі пра паселішчы, што адлюстравана ў «Дапаможніку», звесткамі з архіўных крыніц, якія пры яго стварэнні не выкарыстоўваліся: спісамі населеных пунктаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў на канец 1850-х – пачатак 1860-х гг., інвентарамі панскіх маёнткаў, апісаннямі царкоўных прыходаў і інш. Калі ўдасца апрацаваць гэтыя крыніцы цалкам, атрымаецца найбольш поўная пошукавая сістэма па гісторыі беларускіх паселішчаў.